# Архіў
# 2009

## Змест

**Верасень** ........ **4**
Першая святая Камунія ........ 4
У Кіеве гомельскі парафіянін прыняў «ad missio» ........ 5
Аўстрыйскія спонсары наведалі веску для дзяцей-інвалідаў, якая будуецца у Гомелі ........ 5
У гомельскім касцеле прайшоў дабрачынны канцэрт у падтрымку будаўніцтва дзіцячага хоспіса ........ 6
Убачыла свет першае выданне кнігі «Касцёл і ўлада на Гомельшчыне (20–30-я гады) ........ 7
Гомельскія вернікі ўдзельнічалі ва ўрачыстасці ў гонар благаслаўленага мучаніка ксяндза Багаткевіча ........ 8
У Гомелі сустрэліся сестры-законніцы Пінскай дыяцэзіі ........ 10
**Кастрычнік** ........ **11**
Запрашаем на «Школу веры» ........ 11
Вітаем новую хрысціянскую сям'ю ........ 11
Адбылася прэзентацыя кнігі «Касцел і ўлада на Гомельшчыне (20-30-я гады XX ст.)» ........ 12
Максім-Аўрэлій на шляху да Хрыста ........ 13
Гомельскія вернікі павіншавалі Казіміра Свентэка з 95-годдзем ........ 14
Ужо не я і ты, а МЫ! ........ 15
Мацвей и Алеся - новыя чальцы хрысціянскай супольнасці ........ 17
**Лістапад** ........ **18**
У Дзень усіх святых гомельскія вернікі памаліліся на магілах ксяндзоў ........ 18
У ксяндза Славаміра юбілей (ФОТА З ВІНШАВАННЯ) ........ 18
Гомель наведалі пробашч і вернікі парафіі з нямецкага Брандэнбурга ........ 19
Гомельскі касцел наведаў знакаміты рэжысер Кшыштаф Зануссі ........ 20
**Снежань** ........ **22**
Першы выпуск школы нараджэння "Дар жыцця" адбыўся ........ 22
Хрысціянскія канфесіі Гомеля абмеркавалі праблему СНІДа ........ 23
"Гомельскія вернікі маюць глыбокае спазнанне сваей грэшнасці" ........ 25
Калядныя казкі ад маленькага Юры ........ 26
Раство ў маім дзяцінстве ........ 27
З Раством Хрыстовым! ФОТА і ВІДЭА з першай святочнай імшы ........ 28
Гомельскія памежнікі прынялі ўдзел у імшы на Раство ........ 28

Завершана 9-месячная малітва за ненароджаных дзяцей ........................................ 29
Святочныя дні ў гомельскім касцёле: канцэрт класічнай музыкі і дзіцячая Бэтлеемка ........................................................................................................ 29
Год мінулы, год будучы........................................................................................ 30

# Верасень

## Першая святая Камунія

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 02.09.2009*



**У гомельскай парафіі Нараджэння Божай Маці 22 асобы прынялі Першую святую Камунію. 10 мая 2009 г. у гомельскім касцёле Нараджэння Божай Маці 10 дзяўчынак і 12 хлопчыкаў прынялі Першую святую Камунію.**

Звяртаючыся да парафіянаў у гэты ўрачысты дзень, пробашч касцёла кс. Славамір нагадаў: «Езус дарыць вам сёння сваё Цела, таму што Ён хоча жыць у вас, каб кожны быў Яго святыняю. Для вас сёння адкрываецца цудоўная магчымасць сустракацца з Езусам не толькі ў слове Божым, але і ў іншых сакрамэнтах. Сёння радасны дзень сустрэчы з уваскрослым Панам».

Па словах пробашча, праз таямніцу святой Камуніі Езус дае нам цудоўную магчымасць узмацніць сябе ў любові, таму што толькі ў Богу ёсць любоў, Ён сам ёсць любоў. Ксендз Славамір распавёў дзецям, што людзі самі па сабе не здольны любіць так, каб жыццё аддаваць за іншых, і таму хрысціяне просяць дапамогі ў Пана Бога, імнкуцца быць вернымі і пакорнымі Богу.

«У сатаны няма адной рэчы — ён не мае каленяў, таму ніколі не ўкленчыць перад Богам, ніколі не будзе прасіць дапамогі, не прызнае, што ён сам не здольны любіць. Калі у нас няма Духа Святога, то мы ніколі не прынізімся перад Богам. Таму няма малітвы, няма ўдзелу ў святой Імшы, няма ўваскрашэння Пана у нашым жыцці. Хто не мае Духа Святога, той ніколі не будзе прыніжацца перад Богам — зразумейце гэтую простую, але важную рэч», — заклікаў кс. Славамір. Ён даў настаўленне малым хрысціянам: ні аднаго дня без малітвы, ні адной нядзелі без удзелу ў святой Імшы, ні аднаго месяца без споведзі.

Пасля святой Імшы дзеці падзяліліся сваімі ўражаннямі. «Сёння я адчуў, што Бог мяне любіць, пасля першай споведзі я стаў бліжэй з Богам, я зразумеў, што ен хоча: каб я маліўся і не грашыў. З Божай дапамогай у мяне гэта атрымаецца», — спадзяецца Генадзь Жданаў.

З радасцю і гонарам удзельнічаў разам са старэйшым сынам у святой Імшы Валерый Адамовіч. «Для нас, бацькоў, гэта вельмі важны дзень, сын працягвае справу нашых дзядоў-католікаў, і ў той жа час становіцца прыкладам для траіх малодшых нашых дзяцей. З Богам у сэрцы мы прынялі гэтую падзею», — сказаў бацька.

*[Фота ў каталозе]*

## У Кіеве гомельскі парафіянін прыняў «ad missio»

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 05.09.2009*



**13 мая 2009 г. у кіеўскім касцёле святога Аляксандра адбылася цырымонія прыняцця ў кандыдаты да святарства навучэнцаў міжнароднай семінарыі «Redemptoris Mater» (Кіеўска-Жытомірская дыяцэзія). «Ad missio» прыняў таксама вернік гомельскай парафіі Віктар Прыходзька.**

У гэты дзень сутаны атрымалі таксама семінарысты з Польшчы і Італіі. Урачыстую літургію ўзначаліў біскуп Кіеўскі і Жытомірскі Ян Пурвінскі. Падчас святой Імшы тры семінарысты «Redemptoris Mater» атрымалі благаслаўленне біскупа на публічнае чытанне Святога Пісання, што называецца лектарат. На ўрачыстасць сабраліся шматлікія святары і члены супольнасцяў «Неакатэхуменат» з некалькіх еўрапейскіх краінаў, у тым ліку і з Беларусі.

Пяць гадоў таму біскуп Ян Пурвінскі адкрыў у Кіеве семінарыю «Redemptoris Mater», у якой праходзяць фармацыю святары для супольнасці «Неакатэхуменат». На сённяшні дзень у міжнароднай семінарыі ў Кіеве навучаюцца 17 семінарыстаў з дзевяці краінаў розных кантынентаў.

*[Фота ў каталозе]*

## Аўстрыйскія спонсары наведалі вёску для дзяцей-інвалідаў, якая будуецца у Гомелі

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 05.09.2009*



**20-21 мая 2009 г. з візітам у Гомелі пабывалі госці з аўстрыйскага горада Хард. Спадарыні Дорыс Альгоер і Марыен Моттэр, а таксама іх сем'і і сябры – адны з самых буйных спонсараў, якія пералічваюць сродкі на будаўніцтва хоспіса для дзяцей-сірот з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця.**

Аўстрыйцы сустрэліся з пробашчам гомельскага касцела Нараджэння Божай Маці ксяндзом Славамірам Ляскоўскім. Як паведаміў нам ксендз, праект будаўніцтва дзіцячай вёскі рэалізуе дабрачынная каталіцкая місія «Карытас-Міласэрнасць» Пінскай дыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы. Арганізацыя афіцыйна працуе ў Гомелі з 2003 года. Будоўля вёскі вядзецца за ахвяраванні міжнародных спонсараў.

Аўстрыйцы наведваюць абласны цэнтр ужо не ў першы раз. Мэта іх чарговага візіта – знаемства з наступным этапам будоўлі хоспіса, а таксама вырашэнне пытання аб працягу фінансавання праекта. Акрамя таго, госці традыцыйна дамагаюць Дому міласэрнасці сясцер ордэна Маці Тэрэзы, які працуе ў Гомелі, і мясцовым бедным сем'ям.

Дзіцячая веска разлічана на пражыванне 60 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўмовах, максімальна набліжаных да сямейных. У ей дзеці будуць адчуваць сябе ў бяспецы, жыць у атмасферы дабразычлівасці і любві, прыналежнасці да грамадства і ўпэўненасці ў будучым.

У такіх умовах, а таксама дзякуючы сталым дыдактычным і рэабілітацыйным заняткам, магчыма максімальна поўнае развіцце асобы. Праект прадугледжвае стварэнне пяці асобных груп-сем'яў, кожная з іх будзе уключаць максімум 12 чалавек. Звяном, што спалучае такую групу-сям'ю, стане сястра-манахіня, якая разам з дапаможным персаналам будзе клапаціцца аб належным клімаце выхавання і напоўніць любоўю і ўвагай жыцце дзяцей.

Хоспіс плануецца адкрыць ужо ў наступным годзе. Яго дзейнасць будзе арганізавана пры непасрэдным удзеле і падтрымцы абласнога камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва.

*[Фота ў каталозе]*

## У гомельскім касцеле прайшоў дабрачынны канцэрт у падтрымку будаўніцтва дзіцячага хоспіса

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 05.09.2009*



**29 мая 2009 г. у гомельскім касцеле Нараджэння Божай Маці адбыўся дабрачынны канцэрт класічнай музыкі. Выканаўцаў – камерны склад эстрадна-сімфанічнага аркестра гомельскай абласной філармоніі пал кіраўніцтвам Таццяны Томсан – вітала поўная зала.**

Пробашч касцела кс. Славамір Ляскоўскі пранаваў гледачам пасля заканчэння канцэрта скласці добраахвотную ахвяру ў падтрымку будаўніцтва дзіцячага хоспіса для дзяцей-сірот з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця. Будаўніцтвам вескі займаецца дабрачынная каталіцкая арганізацыя «Карытас-Міласэрнасць».

На пачатку вечарыны кс. Славамір зазначыў: «Гэта канцэрт незвычайны – на ім не змогуць прысутнічаць тыя, у дапамогу якім ен арганізаваны – з-за іх фізічнага стану. Але мы спадзяемся, што гэтыя дзеці пры нашай падтрымцы ўжо праз год будуць жыць у цудоўных умовах, атуленыя клопатам сясцер ордэна Бенедыктынак-Самарыцятак, выхавацеляў і лекараў».

Ксендз нагадаў, што першыя дамы сямейнага тыпу для дзяцей з асаблівасцямі развіцця яшчэ да Другой Сусветная вайны стварыла ў Польшчы Вінцэнта Ядвіга Ярашэўская – заснавальніца Ордэна сясцер Бенедэктынак-Самарыцянак Крыжа Хрыстовага.

На канцэрце прагучалі цудоўныя творы кампазітараў 17-20 стагоддзяў: Джузэпэ Тарэлі, Алесандра Страдела, Егана Себасцьяна Баха, Антоніа Вівальдзі, Джуліа Канчыні, Вольфганга Амадэя Моцарта, Напалеона Орды. Сольную партыю «Ave Maria» Дж. Канчыні выканала заслужаная артыстка Беларусі Галіна Паўлянок.

Дзіцячая веска-хоспіс разлічана на пражыванне ў ёй 60 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўмовах, максімальна набліжаных да сямейных. У такіх умовах, а таксама дзякуючы сталым дыдактычным і рэабілітацыйным заняткам, магчыма максімальна поўнае развіцце асобы.

Праект прадугледжвае стварэнне пяці асобных груп-сем'яў, кожная з іх будзе ўключаць максімум 12 чалавек. Звяном, што спалучае такую групу-сям'ю, стане сястра законная, якая разам з дапаможным персаналам будзе клапаціцца пра належны клімат выхавання і атуляць апекай жыццё дзяцей.

Адкрыццё хоспіса запланавана на наступны год. Яго дзейнасць будзе арганізавана пры непасрэдным удзеле і падтрымцы абласнога камітэта па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва.

*[Фота ў каталозе]*

## Убачыла свет першае выданне кнігі «Касцёл і ўлада на Гомельшчыне (20–30-я гады)

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 22.09.2009*



**У верасні 2009 г. у тыпаграфіі навуковых выданняў у Лодзі (Польшча) убачыла свет першае выданне кнігі «Касцёл і ўлада на Гомельшчыне (20–30-я гады XX ст.)». Выданне ўключае невядомыя да нядаўняга часу архіўныя матэрыялы, якія выяўляюць палітыку савецкай улады ў адносінах да Каталіцкага Касцёла ў БССР у 20–30-я гады мінулага стагоддзя.**

Зборнік быў падрыхтаваны выкладчыкамі кафедры гісторыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны Віктарам Пічуковым і Андрэем Лебедзевым у суаўтарстве з дэканам Гомельскага дэканата кс. прэлатам Славамірам Ляскоўскім, які з'яўляецца пробашчам парафіі Нараджэння Божай Маці ў Гомелі. Выданне ўбачыла свет дзякуючы падтрымцы Інстытута нацыянальнай памяці (Instytut Pamieci Narodowej) і Інстытута Цэнтральна-Усходняй Еўропы (Instytut Europy Srodkowo-Wschodniej). Наклад першага выдання складае 500 асобнікаў. Ксёндз Ляскоўскі не выключае магчымасці таго, што кніга будзе перавыдадзена.

Прадмову да кнігі напісаў прафесар Люблінскага каталіцкага універсітэта імя Яна Паўла II (Польшча) кс. Раман Дзванкоўскі, які з'яўляецца даследчыкам адносінаў савецкай улады і Каталіцкага Касцёла на тэрыторыі СССР. Гэтай тэме ён прысвяціў шэраг манаграфій, публікацый і навуковых выданняў. Ва ўводзінах да кнігі кс. Дзванкоўскі называе яе «беспрэцэндэнтнай публікацыяй». «Большасць з 369 дакументаў, апублікаваных у кнізе, былі створаны дзяржаўнымі арганізацыямі, партыйнымі органамі і Саюзам ваяўнічых бязбожнікаў, што ўваходзіў у дзяржаўныя структуры. Яны падцвярджаюць вядомы тэзіс аб тым, што барацьба з рэлігіяй і Каталіцкім Касцёлам, які лічыўся бастыёнам супрацьстаяння камуністычнаму рэжыму, была адным з найбольш важных заданняў савецкай улады. Мэта ліквідацыі Касцёла, якую яна ставіла перад сабой, была дасягнута ў 1938 годзе. Тады ў

Беларусі (і не толькі) былі расстраляны апошнія святары, зачынены ўсе касцёлы», — адзначае ў прадмове кс. Дзванкоўскі. Ён таксама звяртае ўвагу чытачоў на дакументы, якія сведчаць пра тое, як вернікі абаранялі сваё рэлігійнае жыццё і былі асуджаны за гэта на зняволенне або расстрэл. Прафесар мяркуе, што дзякуючы выданню з’явілася магчымасць навуковага вывучэння лёсу Касцёла ў Беларусі ў найбольш крывавы і трагічны перыяд яго гісторыі. Дакументы зборніка паходзяць з Гомельшчыны, але метады барацьбы з рэлігіяй і Каталіцкім Касцёлам на былых усходніх межах Рэчы Паспалітай былі падобныя да тых, якія выкарыстоўваліся ў міжваенны перыяд у іншых месцах.

Аўтары выдання і іншыя гісторыкі збіралі дакументы для кнігі ў архівах грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці, адкрытых фондах КДБ, а таксама мазырскага Занальнага дзяржаўнага архіва. «Дакументы дазваляюць уявіць агульную карціну ўзмацнення ціску ўлады на РКК, абмежавання яе жыццядзейнасці ў 20-я гады, нарастання рэпрэсійных тэндэнцый, татальнага афіцыйнага гвалту над Касцёлам у 30-я гады», — падкрэсліваюць аўтары кнігі. Зборнік складаецца з шэрагу дакументаў: ад пастановаў ЦК КПБ да бягучага справаводства мясцовага партыйнага кіраўніцтва, следчых матэрыялаў ГПУ і НКУС у перыяд палітычных рэпрэсій канца 20–30 гг. у адносінах да святароў і касцёльнага актыву.

Асаблівую цікавасць выклікаюць дакументы, у якіх раскрываецца лёс асобных дзеячаў Касцёла. У зборнік таксама ўключаны некаторыя матэрыялы мясцовага і рэспубліканскага перыядычнага друку, фатаграфіі і картаграфічны матэрыял. «Перыяд 20–30-х гг. цікавы не толькі сваёй маладаследаванасцю, але і тым, што гэта быў, напэўна, самы драматычны перыяд у гісторыі Рыма-каталіцкага Касцёла ў Беларусі», — лічаць аўтары кнігі і выказваюць спадзяванне, што дакументальныя матэрыялы зборніка паслужаць на карысць больш аб’ектыўнаму вывучэнню гісторыі Касцёла ў БССР у міжваенны перыяд.

## Гомельскія вернікі ўдзельнічалі ва ўрачыстасці ў гонар благаслаўленага мучаніка ксяндза Багаткевіча

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 27.09.2009*



**26 верасня вернікі Пінскай дыяцэзіі прынялі ўдзел ва ўрачыстасцях, прымеркаваных да 10-й гадавіны беатыфікацыі благаслаўленага мучаніка ксяндза Мечыслава Багаткевіча. Ушанаваць памяць забітага фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны святара ў лунінецкі касцел прыехалі парафіяне з Баранавічаў, Пінска, Гомеля, Рэчыцы, Мазыра**.

Урачыстасці пачаліся з прывітання дапаможным біскупам Пінскай дыяцэзіі Казімірам Велікасельцам пілігрымаў — маладых хлопцаў і дзяўчат з Пінска і Баранавічаў, што прыехалі на роварах з Лобчы і Бастыня ў Лунінец. Моладзь была апранута ў адмысловыя футболкі з выявай ксяндза Мечыслава Багаткевіча і

надпісам «Няхай жыве Хрыстус Валадар». 20-кіламетровы велапрабег моладзь прысвяціла 10-й гадавіне беатыфікацыі ксяндза.

Святую Імшу цэлебраваў Апостальскі Адміністратар Пінскай дыяцэзіі ксендз-кардынал Казімір Свентэк. Ен выказаў сардэчную ўдзячнасць усім святарам, сестрам-законніцам, вернікам, што прынялі ўдзел у набажэнстве. Асаблівую падзяку ксендз-кардынал выказаў канцлеру курыі Пінскай дыяцэзіі Станіславу Паўліне — за ініцыятыву і арганізацыю мерапрыемства, а таксама ксяндзу Алегу Шпецу, душпастыру ў Лунінцы. «Ксендз тут з'явіўся нядаўна, але за кароткі час ен аднавіў «статус кво» – існавання лунінецкай парафіі і касцела», - адзначыў ксендз-кардынал. Ен пажартаваў, што, суправаждаючы пілігрымаў на ровары, сам задумваўся аб тым, ці змог бы таксама праехаць на двух колах. «Напэўна, не рашыўся б — улічыце мой узрост», – заўважыў ксендз-кардынал. На заканчэнне набажэнства ўсе пробашчы парафій Пінскай дыяцэзіі атрымалі плакаты з выявай благаслаўленага мучаніка Мечыслава Багаткевіча, а ўсе удзельнікі мерапрыемстваў — буклеты з інфармацыяй пра жыццевы шлях слугі Хрыста.

10 гадоў таму, 13 чэрвеня 1999 года ў часе ўрачыстай св. Імшы ў Варшаве Ян Павел Другі абвясціў благаслаўленымі 108 мучанікаў. Сярод іх было 12 чалавек, якія сваім жыццем, працай і мучаніцкай смерцю былі звязаны з Беларуссю. Адзін з іх — ксендз Мечыслаў Багаткевіч, святар Пінскай дыяцэзіі.

М.Багаткевіч нарадзіўся 29 кастрычніка 1904 года ў Крыкалах (Віленскае ваяводства). Вучыўся ў гімназіях у Будславе, Докшыцах і Навагрудку. Скончыў вышэйшую духоўную семінарыю ў Пінскай дыяцэзіі. Працаваў катэхетам і выхавацелем у ніжэйшай духоўнай семінарыі, быў у Лунінцы прэфектам сярэдніх і агульных школаў. Калі пачалася вайна, ен стаў вадроўным душпастырам. Ксендз быў арыштаваны ў Дрысе ў студзені 1942 года органамі нямецкай атэістычнай нацысцкай сістэмы і растраляны 3 сакавіка 1942 года разам з ксяндзамі Станіславам Пыртакам і Уладзіславам Мацьковякам у лесе Барок каля Беразвечча на тэрыторыі глыбоцкай парафіі. Ен пражыў 39 гадоў, 9 з якіх прайшло ў святарстве.

У апошнім лісце да сваіх родных ксендз Мечыслаў пісаў: «У гэту ноч ідзем на смерць я і мае браты ў святарстве з Іказьні. Іду спакойна і маю надзею на Бога, што мае цярпенні і мая кроў заслужаць мне збаўленне. Відаць, такая Божая воля, бо я мог уцячы з Дрысы, таксама і адсюль, але баяўся, каб не парушыць Божую волю і каб пазней пры смерці не мець дакораў сумлення. Я дзякую вам, дарагая мама, і Вам, браты і сестры, за ўсе. Не плачце па мне, а толькі радуйцеся, што наш нашчадак здаў экзамен. Я прашу вас толькі аб малітве, а таксама іншых знаемых братоў у святарстве і маіх сяброў». «Няхай жыве Хрыстус Валадар!» - гэтымі словамі скончыў святар свой апошні ліст, які быў занатаваны ў брэвіярыі.

*[Фота ў каталозе]*

## У Гомелі сустрэліся сестры-законніцы Пінскай дыяцэзіі

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 28.09.2009*



**Чарговая малітоўная сустрэча сясцер-законніц Пінскай дыяцэзіі адбылася 28 верасня ў гомельскім касцеле Нараджэння Божай Маці. На мерапрыемства з'ехаліся дзясяткі манахінь з разнастайных ордэнаў:**

Бенедэктынак-Самарыцянак Крыжа Хрыстовага, Кармелітанак, Палацінак, Святой Сям'і, сестры міласэрнасці Ордэна Маці Тэрэзы, а таксама іншых ордэнаў.

«Сення прыехалі законніцы з Пінска, Брэста, Баранавічаў, Светлагорска – нават цяжка пералічыць усе гарады, – кажа сястра Паўліна з ордэна Бенедэктынак-Самарыцянак Крыжа Хрыстовага. – Такія сустрэчы праводзяцца ўжо больш за дзесяць гадоў, апошнім разам мы збіраліся ў маі. Нам неабходна сустракацца дзеля ўзаемнай падтрымкі, абмеркавання супольных праблемаў. Але ў першую чаргу, нас усіх яднае Езус, таму на сустрэчах заўседы адбываецца споведзь, Святая Імша, ладзяцца супольныя малітвы».

Для ўдзелу ў сустрэчы у Гомель прыехаў таксама дапаможны біскуп Пінскай дыяцэзіі Казімір Велікаселец – духоўны айцец сясцер-законніц.

*[Фота ў каталозе]*

# Кастрычнік

## Запрашаем на «Школу веры»

*Аўтар: ўласная інфармацыя*
*Дата стварэння: 05.10.2009*



**З 5 кастрычніка ў нашым касцёле пачынаюцца сустрэчы «Школа веры». Запрашаем моладзь і дарослых, каталікоў і праваслаўных, вернікаў і няверуючых.**

Тут вы зможаце паглыбіць свае духоўныя пазнанні, знайсці адказы на пытанні, што цікавяць вас, даведацца аб жыцці Царквы. А таксама – падрыхтавацца да прыняцця сакрамэнтаў хросту і вянчання. «Школа веры» чакае тых, хто не бачыць сэнсу жыцця, хто адзінокі або мае праблемы ў сям'і, хто шукае сваё пакліканне, сустрэчы з Богам.

Сустракаемся кожны панядзелак у 19.30 (уваход са двара). Не засмучайцеся, калі даведаліся аб сустрэчах позна і не паспелі прыйсці 5 кастрычніка. Падключыцца да заняткаў можна ў любы час.

## Вітаем новую хрысціянскую сям'ю

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 06.10.2009*



**У нядзелю вернікі гомельскага касцелу былі сведкамі сакрамэнту сужэнства – у гэты дзень перад Богам і людзьмі Юрый і Ала Мацюшкіны ўрачыста паабяцалі любіць і паважаць аднаго, быць вернымі – у радасці і горы, аж да смерці.**

Невыпадкова – бо Божы Провід не мае паняцця выпадковасці, у гэту нядзелю з амбона мы чулі Слова Божае пра стварэнне жанчыны, пра тое, як двое могуць быць адным целам, што «Бог злучыў, чалавек няхай не разлучае», пра каштоўнасць хрысціянскага шлюбу і пакліканне – сужэнства.

«Не добра, каб чалавек быў адзін. Ствару адпаведную яму дапамогу... І сказаў Адам: Гэта косць ад касцей маіх і цела ад майго цела. Яна будзе названа жанчынай, бо ад мужчыны была ўзята. Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці сваю і прылепіцца да жонкі сваёй, і стануць яны адным целам» (Быц. 2, 18-24).

«Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці сваю і злучыцца са сваёй жонкай, і будуць двое адным целам. Так што яны ўжо не двое, але адно цела. Таму тое, што Бог злучыў, чалавек няхай не разлучае». (Мк 10, 2–12). Так нагадвае нам Слова Божае.

Сужэнства благаславіў ксендз Славамір Ляскоўскі. Ен зычыў маладым быць сапраўднай хрысціянскай сям'ей, крочыць за Езусам, чэрпаць натхненне ў шлюбе і ўсе неабходныя ласкі ў міласэрднасці Пана Бога.

Пробашч касцела ўзгадаў, што па яго падліках, за апошнія 20 гадоў 5% шлюбаў, заключаных у гомельскім касцеле, былі скасаваны. «Але ўсе-такі 95% сем'яў захавалі шлюб, і гэта выклікае радасць», - адзначыў ксендз. Між тым, па афіцыйнай статыстыцы, на 1000 шлюбаў у Беларусі за першае паўгоддзе 2009 года прыйшлося 555 разводаў.
*[Фота ў каталозе]*

## Адбылася прэзентацыя кнігі «Касцел і ўлада на Гомельшчыне (20-30-я гады XX ст.)»

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 06.10.2009*



**4 кастрычніка ў гомельскім касцеле адбылася прэзентацыя кнігі «Касцел і ўлада на Гомельшчыне (20-30-я гады XX ст.)». На мерапрыемстве прысутнічалі аўтары кнігі — выкладчыкі-гісторыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту ім. Ф.Скарыны Віктар Пічукоў і Андрэй Лебедзеў, а таксама ксендз-дэкан Славамір Ляскоўскі.**

Удзельнікамі прэзентацыі былі каля 30 чалавек — парафіяне касцелу, студэнты гістарычнага факультэту ГГУ, людзі, што цікавяцца гісторыяй. Аўтары кнігі распавялі пра ідэю стварэння выдання, збор матэрыялаў, які цягнуўся каля 10-ці гадоў. Кніга была выдадзена невялікімі накладам — 500 асобнікаў, але, зыходзячы з зацікаўленасці людзей, было прынята рашэнне аб другім выданні зборніка. Аўтары паабяцалі, што яно будзе больш поўным, насычаным дадатковымі матэрыяламі.

Таксама аўтары кнігі распавялі пра свае планы — падрыхтоўку новай кнігі, якая будзе складацца з успамінаў людзей, сведкаў часоў пераследу Каталіцкага Касцелу на Беларусі ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя. На дадзеным этапе збіраюцца матэрыялы для новага зборніка. Асобнікі ж выдання «Касцел і ўлада на Гомельшчыне» пакуль можна ўбачыць толькі ў яго аўтараў, але на гэтым тыдні адзін экзэмпляр кнігі будзе перададзены ў Гомельскую абласную бібліятэку ім. У.Леніна. Першае выданне кнігі «Касцёл і ўлада на Гомельшчыне (20–30-я гады XX ст.)» убачыла свет у верасні 2009 г. у тыпаграфіі ў Лодзі (Польшча). Зборнік уключае невядомыя да нядаўняга часу архіўныя матэрыялы, якія выяўляюць палітыку савецкай улады ў адносінах да Каталіцкага Касцёла ў БССР у 20–30-я гады мінулага стагоддзя. Выданне выйшла дзякуючы падтрымцы Інстытута нацыянальнай памяці (Instytut Pamieci Narodowej) і Інстытута Цэнтральна-Усходняй Еўропы (Instytut Europy Srodkowo-Wschodniej).

Аўтары кнігі і іншыя гісторыкі збіралі дакументы ў архівах грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці, адкрытых фондах КДБ, а таксама мазырскага

Занальнага дзяржаўнага архіва. «Дакументы дазваляюць уявіць агульную карціну ўзмацнення ціску ўлады на РКК, абмежавання яе жыццядзейнасці ў 20-я гады, нарастання рэпрэсійных тэндэнцый, татальнага афіцыйнага гвалту над Касцёлам у 30-я гады», — падкрэсліваюць аўтары кнігі. Зборнік складаецца з шэрагу дакументаў: ад пастановаў ЦК КПБ да бягучага справаводства мясцовага партыйнага кіраўніцтва, следчых матэрыялаў ГПУ і НКУС у перыяд палітычных рэпрэсій канца 20–30 гг. у адносінах да святароў і касцёльнага актыву.

Асаблівую цікавасць выклікаюць дакументы, у якіх раскрываецца лёс асобных дзеячаў Касцёла. У зборнік таксама ўключаны некаторыя матэрыялы мясцовага і рэспубліканскага перыядычнага друку, фатаграфіі і картаграфічны матэрыял. «Перыяд 20–30-х гг. цікавы не толькі сваёй маладаследаванасцю, але і тым, што гэта быў, напэўна, самы драматычны перыяд у гісторыі Рыма-каталіцкага Касцёла ў Беларусі», — лічаць аўтары кнігі і выказваюць спадзяванне, што дакументальныя матэрыялы зборніка паслужаць на карысць больш аб’ектыўнаму вывучэнню гісторыі Касцёла ў БССР у міжваенны перыяд.

*[Фота ў каталозе]*

## Максім-Аўрэлій на шляху да Хрыста

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 15.10.2009*



**«Ідзіце і навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога. Хто паверыць і ахрысціцца – будзе збаўлены» (гл. Мц 28, 19; Мк 16,15.16), – гэтымі словамі Пан Езус устанавіў першы з сямі сакрамэнтаў – сакрамэнт святога хросту.**

Толькі пасля прыняцця хросту можам прымаць іншыя сакрамэнты.

Праз святы хрост Пан ачышчае нас ад заганы першароднага граху, адпускае ўсе правіны, учыненыя да хрышчэння, удзяляе надпрыродны дар Божай асвячальнай ласкі, адраджае да новага жыцця дзяцей Божых, акрамя таго, праз хрост людзі далучаюцца да супольнасці люду Божага – Касцёла. Звычайна ўдзяляе сакрамэнт хросту святар альбо дыякан, а ў выпадку небяспекі смерці, калі няма святара, ахрысціць можа кожны чалавек.

Імя, якое даецца пры хрышчэнні, павінна быць імем святога альбо святой, каб ахрышчаны меў прыклад для наследавання і свайго заступніка ў Бога. Хрост – гэта толькі пачатак, які патрабуе далейшага развіцця, пераходу ў таямніцу хрысціянскай веры і да жыцця паводле прынятай веры. Гэта – абавязак бацькоў, хросных і самаго ахрышчанага. (паводле **www.waladarka.by**)

У кастрычніку ў нашым касцеле адбыўся хрост маленькага **Максіма-Аўрэлія**. Віншуем новага хрысціяніна і яго бацькоў з гэтай важнейшай падзеяй у зямным жыцці!

*[Фота ў каталозе]*

## Гомельскія вернікі павіншавалі Казіміра Свентэка з 95-годдзем

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 21.10.2009*



**95-годдзе адзначыў 21 кастрычніка старэйшы іерарх Каталіцкага Касцела на Беларусі, ксендз-кардынал, Апостальскі Адміністратар Пінскай дыяцэзіі, арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі на пенсіі Казімір Свентэк.**

Павіншаваць юбіляра прыехалі госці з розных парафій Пінскай дыяцэзіі, святары, сестры-законніцы, вернікі, у тым ліку Мазырскага і Гомельскага дэканатаў. З Гомеля ў пінскую катэдру прыбылі 15 пілігрымаў з ксяндзом-дэканам Славамірам Ляскоўскім. Свае віншаванні ксяндзу-кардыналу накіравалі прадстаўнікі ўлады рэспублікі, Брэсцкай вобласці, горада Пінска. Павіншавалі юбіляра Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Апостальскі Візітатар для грэка-католікаў Беларусі Архімандрыт Сяргей Гаек, ардынарый дыяцэзіі Лімбурга Франц-Пэтэр ван Тэбарц Элст (Германія), выкладчыкі і навучэнцы духоўнай семінарыі, святары і сестры-законніцы.

Гамілію прамовіў Мітрапаліт Тадэўш Кандрусевіч. Ен адзначыў, што кардынал усім сваім жыццем сведчыў пра вернасць Божаму пакліканню. «Вось, Пане, стаю перад табою, іду выканаць Тваю Волю, - так адказаў ты, Эмінэнцыя, калі скончыў семінарыю. Так казаў ты, калі асудзілі цябе на растрэл, арыштавалі, адправілі ў сталінскі лагер. «Іду, Пане, выконваць Тваю Волю», - так адказаў ты на арышты, ссылку, катаржную працу. Але і там ты быў патрэбны! Трэба было, таксама ў лагеры, даваць людзям надзею, праводзіць іх да Бога. «Пане, іду выконваць Тваю Волю!» - так казаў ты, Эмінэнцыя, калі вярнуўся з лагераў, пачаў служэнне, быў прызначаны арцыбіскупам. Прайшоўшы ваду, агонь і медныя трубы, ты захаваў вернасць. Вернасць твая хай будзе тым элементам Новай Евангелізацыі. Тым сведчаннем, што праводзіць людзей да Бога», - такімі словамі звярнуўся Мітрапаліт да кардынала.

Кандрусевіч засяродзіў увагу на тым, што ксендз-кардынал праз усе жыцце не губляў надзеі, гэтай надзеяй ен дзяліўся з людзьмі. «У мінулую нядзелю мы чулі Слова Божае аб тым, што, хто хоча быць першым — павінен быць слугой. Эмінэнцыя быў слугой алтара, слугой канфесіяналу, тых людзей, да якіх яго пасылаў Бог. Сення мы ўзносім удзячнасць Богу за вашыя 95 гадоў жыцця, 70 гадоў святарства, 19 гадоў біскупскага служэння, 15 гадоў кардынальскага служэння. Вы ведаеце, што ў новых абставінах патрэбна ваша служэнне — бо сенняшні чалавек, якому ніхто не забараняе маліцца, хадзіць да касцела, жыве так, як быццам Бога няма. Ен часта застаецца толькі «нядзельным хрысціянінам». Так, свет змяняецца! Але Божае права — не змяняецца, яно нязменнае: не крадзі, не забівай, жыві ў чысціні. Сення вельмі патрэбна ваша сведчанне, сведчанне вашым жыццем. Сення Вы ў гэтым узрушаным моры з'яўляецеся капітанам карабля, пасажыры якога чакаюць вашага сведчання, вашага слова. Сення мы просім Бога, каб благаславіў Вас на доўгія гады. Каб надалей вы неслі людзям надзею, каб яны будавалі сваю

будучыню на падмурках Евангелля, на моцнай скале, якой з'яўляецца сам Езус», - рэзюміраваў Мітрапаліт.

Пасля сканчэння святочнай Літургіі ксендз-кардынал і яго госці маліліся каля труны Слугі Божага Зыгмунта Лазінскага. Менавіта для труны біскупа Лазінскага ў далекім 1933 годзе Казімір Свентэк зразумеў свае пакліканне і адказаў: «Вось, Пане, іду выканаць Тваю Волю!»

*[Фота ў каталозе]*

## Ужо не я і ты, а МЫ!

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 25.10.2009*



**24 кастрычніка быў незвычайным і вельмі важным днем у жыцці Івана Бічана і Алены Краўчук. Учарашнім днем яны хадзілі кожны па сваіх шляхах, шукалі свае пакліканне, а сення разам прыйшлі прасіць благаслаўлення Пана Бога на стварэнне новай сям'і. З сенняшняга дня яны ўжо будуць часцей карыстацца ў адносінах да сябе займеннікам «мы», а не «я» і «ты».**

Перад Богам і ўсімі прысутнымі на ўрачыстасці Іван і Алена абяцалі любіць адзін аднаго, паважаць, быць вернымі – аж да смерці. Дапамогу ў выкананні такіх сур'езных абяцанняў яны прасілі ў Бога ўсемагутнага ў Тройцы адзінага і ўсіх святых.

Сужэнства благаславіў пробашч касцела ксендз-дэкан Славамір Ляскоўскі. Звяртаючыся да маладых і гасцей, ен засяродзіў увагу на тым, што есць самае важнае і неабходнае ў жыцці хрысціянскай сям'і. «Слова Божае важнейшае, чым муж, чым жонка, Слова Божае важнейшае, чым вашыя бацькі, Яно важнейшае за вашыя планы. Словам Пан стварыў свет, і праз Слова абвясціў сваю любоў да чалавека. Праз Слова Божае ўсе здзяйсняецца ў вашым жыцці. Гэтым Словам Бог дадае ў вас прыгажосці свайго стварэння, дорыць вам больш шчодрую любоў, чым бацькоўскую. Слова Божае павінна знайсці ў вашых сэрцах і думках тое, што прасіў цар, які ўсе меў — Прамудрасці. (3 кніга Валадарстваў). Калі не будзеце мець Духа Святога і Прамудрасці Божай — не будзеце нічога разумець», - падкрэсліў пробашч. «Бог прыгатаваў для вас вельмі-вельмі прыгожы шлях — цяпер ужо для дваіх. Як ікону майце перад сабою Святое Сямейства», - заклікаў святар.

У сваім казанні ксендз узгадаў словы Благаслаўленай маці Тэрэзы: «Бог паклікаў нас не для поспеху, а каб мы былі вернымі». «Поспех — небяспечная справа, - папярэдзіў святар. - Не шукайце поспеху ў сваім сужэнстве, і не думайце, што ваш шлюб будзе лепшым, чым у вашых бацькоў, знаемых, сяброў. Таму што чалавек — такая дзіўная істота: усе ведае, разумее, але — не робіць».

«Чалавеку патрэбна перш за ўсе любоў і міласэрнасць Бога. А ад вас патрэбна толькі ваша рашэнне, гатоўнасць вашага сэрца, усе астатняе Госпад бярэ на сябе. Вельмі важна сур'езна падыходзіць да свайго паклікання. Любоў пачынаецца тады, калі нам даводзіцца браць слабасці іншых на сябе і прымаць гэта як належнае. Тое,

што сення адбываецца — вельмі важна, гэта Дар Божы для вас. Зычу вам, каб ваша сям'я, ваш дом быў як храм. Каб вашыя сябры, знаемыя, прыходзячы да вас у госці, атрымлівалі ад вас Слова Божае. Каб вы былі сведкамі Ўваскрашэння, каб у вашым доме, хатняй Царкве, людзі знайшлі выратаванне, якое прыходзіць толькі ад Езуса Хрыста», - з такімі пажаданнямі звярнуўся пробашч да Івана і Алены.

НЕКАЛЬКІ СЛОВАЎ ПРА САКРАМЭНТ СУЖЭНСТВА

Св.Ян Хрызастом, вялікі біскуп Канстанцінопальскі, раіць мужам так звяртацца да сваіх жонак: «Узяў цябе ў свае абдымкі і люблю цябе больш за сваё жыццё. Бо ведаю, што цяперашняе жыццё - нішто, а маім самым гарачым жаданнем з'яўляецца: пражыць яго з табой такім чынам, каб быць упэўненым, што не будзем раздзелены і ў тым жыцці, якое для нас падрыхтавана. Любоў да цябе стаўлю над усім і нішто не было б для мяне больш балючым, чым нязгода з табою» (ККК 2365).

Св. Пісанне пачынаецца з расповяда аб стварэнні мужчыны і жанчыны на вобраз і падабенства Божае, а заканчваецца візіяй «Бяседы Баранка». Ад пачатку і да канца ў Св. Пісанні гаворыцца пра шлюб і яго «таямніцу», пра яго ўстанаўленне і значэнне, якое надаў яму Бог, пра яго пачатак і мэту, пра розныя спосабы яго здзяйснення ў Гісторыі збаўлення, пра яго цяжкасці, што вынікаюць з граху, і яго аднаўленні ў «Пане, у Новым Саюзе Хрыста і Касцёла» (ККК 1602).

Бог стварыў чалавека з любові, паклікаў яго таксама да кахання. Бо чалавек быў створаны на вобраз і падабенства Бога, які сам ёсць Любоў. Паколькі Бог стварыў мужчыну і жанчыну, іх узаемнае каханне становіцца вобразам абсалютнай і незнішчальнай любові, якою Бог любіць чалавека» (ККК 1604).

«Згода, праз якую муж і жонка аддаюць сябе адзін аднаму і ўзаемна прымаюць адзін аднаго, змацавана самім Богам. З іх саюза па волі Божай узнікае трывалы інстытут таксама і ў адносінах да грамадства. Саюз мужа і жонкі ўваходзіць у саюз Бога з людзьмі: «Сапраўдная любоў мужа і жонкі ўключаецца ў Божую любоў» (ККК 1639).

Хрыстус выходзіць насустрач хрысціянскім сужэнцам, застаецца з імі і дае сілы пайсці за Ім і ўзяць на сябе свой крыж, дае сілы падымацца пасля няўдач, прабачаць адно аднаму і сумесна пераносіць цяжкасці. Дапамагае ім узаемна падпарадкоўвацца ў боязі Хрыстовай і любіць любоўю надзвычайнаю, пяшчотнаю і плоднаю. У радасці іх кахання і сямейнага жыцця Хрыстус ужо тут дае ім прадчуванне асалоды «Бяседы Баранка» (ККК 1642).

Трывалая супольнасць жыцця і сужэнскай любові, устаноўленая Творцам і ўнармаваная Яго законамі, фарміруецца праз шлюбны саюз, гэта значыць, праз канчатковую асабістую згоду. Гэты святы саюз дзеля дабра, як мужа і жонкі, іх нашчадкаў, так і грамадства, не залежыць ад людскога меркавання, бо сам Бог ёсць творцам сужэнства, адоранага рознымі дабрадзейнасцямі і мэтамі. **(урыўкі з кнігі «Божая візія сужэнства і сям'і: Сінадальная душпастырская дапамога для нарачоных». Выдавецтва Pro Christo).**
*[Фота ў каталозе]*

**Мацвей и Алеся - новыя чальцы хрысціянскай супольнасці**

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 26.10.2009*



**Мінулая нядзеля стала асаблівым днём для двух сямейных пар з Гомеля: іх дзеці прынялі сакрамэнт хросту. Цяпер у бацькоў Мацвея Гуліцкага і Алесі Ткачовай з'явілася значна больш адказнасці: яны павінны пачаць перадаваць сваім дзецям Веру.**

З нядзелі больш сур'ёзнай стала жыццё і ў саміх немаўлят - яны прыняты ў чальцы хрысціянскай супольнасці. Гэта значыць, што паступова яны будуць адкрываць для сябе Слова Божае і рыхтавацца выконваць Божую Волю.

Публікуем здымкі, зробленыя пасля хрышчэння. На першай фатаграфіі - Алеся Ткачова з бацькамі Андрэем і Аленай і хросныя. На другім - Мацвей Гуліцкі з бацькамі Андрэем і Ганнай, хроснымі і ксяндзом Славамірам.

*[Фота ў каталозе]*

# Лістапад

## У Дзень усіх святых гомельскія вернікі памаліліся на магілах ксяндзоў

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 02.11.2009*



**1 лістапада, у Дзень усіх святых, прайшло набажэнства на Навабеліцкіх могілках у Гомелі, дзе знаходзяцца магілы двух ксяндзоў. Малебен правёў пробашч парафіі Нараджэння Божай Маці айцец Славамір, разам з ім на могілках маліліся каля трыццаці вернікаў.**

Да магіл святароў ўсклалі кветкі і запалілі свечкі. Імя аднаго з памерлых ксяндзоў, на жаль, не вядомае – знікла металічная шыльда на ягонай магіле. Але на помніку захаваліся сімвалы, дзякуючы якім можна меркаваць, што тут пахаваны менавіта святар.

Другая магіла – ксяндза Баляслава Вайшвіла, законанастаўніка пры гомельскіх мужчынскай і жаночай прагімназіях. Святар памёр яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады. Больш падрабязную інфармацыю аб ім мы спадзяемся з часам размясціць ў рубрыцы «Гісторыя».

*[Фота ў каталозе - Фота Аляксандра Забароўскага]*

## У ксяндза Славаміра юбілей (ФОТА З ВІНШАВАННЯ)

*Аўтар: Павел & Алена*
*Дата стварэння: 04.11.2009*



**4 лістапада адзначыў сваё 50-годдзе пробашч касцёла Нараджэння Божай Маці, дэкан Гомельскага дэканата Славамір Ляскоўскі. Апошніх дваццаць гадоў свайго жыцця ён прысвяціў служэнню ў Гомелі.**

Айцец Славамір нарадзіўся ў Гданьску, на выдатна вучыўся ў Люблінскай сельскагаспадарчай акадэміі, але пакінуў яе дзеля семінарыі. У 1987 годзе ён быў пасвечаны Папам Янам Паўлам ІІ. У 2005 годзе кс. Славамір атрымаў ступень ліцэнцыята багаслоўскіх навук у Люблінскім каталіцкім універсітэце.

Да юбілею нашага пробашча, мы сабралі аб ім некалькі водгукаў. Цёплыя словы пра святара сказалі як парафіяне, так і прадстаўнікі ўлады.

**Старшыня савета па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Прусаў:**

– Мы з вялікай павагай ставімся да ксяндза Славаміра. Гэта вельмі прагрэсіўны чалавек, яго служэнне ў Гомелі - гэта цэлы шэраг пабожных спраў. Шчыра віншую юбіляра, жадаю яму здароўя ў імя вялікай працы на карысць духоўнага развіцця нашай Радзімы.

**Яна, 27 гадоў:**

– Ён сапраўдны бацька: любячы, пяшчотны, патрабавальны і суровы. Інтэлігентны, разумны і начытаны. Некалькіх слоў, якія ён скажа, мне заўсёды хапае для таго, каб зразумець, што трэба навяртацца, і як менавіта гэта рабіць. Жадаю яму шукаць і выконваць Божую Волю, не губляць жыццёвай энергіі і аптымізму.

**Аляксандр, 53 гады:**

– Айцец Славамір - святар ад Бога. Дзякуючы яму ў нас, у Гомелі, такі цудоўны касцёл. Праз него дзейнічае Госпад, таму хрысціянства у нас развіваецца і мацнее.

**Зміцер, 30 гадоў:**

– Ксёндз Славамір - такі ж грэшнік, як і мы. Дзякуючы таму, што ён гэта выдатна бачыць, ён ведае, чым і як лепш дапамагаць нам. Жадаю ксяндзу, каб яго мары ажыццявіліся, і ён трапіў у Царства Божае.

**Алег, 10 гадоў:**

– Ён добры, вясёлы, часта частуе нас цукеркамі і апельсінамі, дапамагае ва ўсім. Я жадаю ксяндзу Славаміру быць шчаслівым і мець шмат сяброў.

**Юра, 7 гадоў:**

– У яго ёсць дабрыня, ён любіць іншых людзей і служыць верна Богу. Я жадаю ксяндзу Славаміру, каб ён не хварэў і быў шчаслівым.

Лепей ісці па шляху, калі ведаеш канчатковы пункт гэтага падарожжа. Таксама дапамагаюць трымаць правільны кірунак указальнікі і дарожныя знакі. Хай пробашч будзе тым, хто дакладна накіроўвае хрысціяніна.

**Песнямі і кветкамі дарослыя і дзеці парафіі павіншавалі ў нядзелю ксяндза Славаміра з юбілеем.**

*[Фота ў каталозе]*

## Гомель наведалі пробашч і вернікі парафіі з нямецкага Брандэнбурга

*Аўтар: Алена Германовіч*

*Дата стварэння: 14.11.2009*



**14 лістапада Гомель наведалі пробашч і вернікі парафіі Святой Троіцы з нямецкага горада Брандэнбурга. Трэба заўважыць, што парафіяне з Брандэнбурга прынялі актыўны ўдзел у зборы ахвяраванняў для будаўніцтва дзіцячай вескі для сірот і інвалідаў у Навабеліцы, а зараз пробашч і вернікі прыехалі ў Гомель, каб паглядзець, як ідуць справы на новабудоўлі.**

«Нямецкія госці засталіся вельмі задаволеныя ўбачаным, поспехамі ў будаўніцтве, яны усцешаны, што маюць магчымасць дапамагаць нашым беларускім дзецям. Іх парафія ў Брандэнбургу невялікая, але гэта вельмі актыўныя людзі, якія з гатоўнасцю адклікнуліся на заклік дапамагчы ў будаўніцтве дзіцячай вескі», - адзначыў ксендз Славамір.

Падчас Святой Імшы ў гомельскім касцеле кс. Рыхард Рупрэхт распавеў, што ў Брандэнбургу каля 3% жыхароў складаюць каталікі, а гэта каля 2,5 тысяч чалавек, але з іх толькі каля 500 рэгулярна наведваюць касцел, 20% - лютэране, астатнія людзі не лічаць сябе веруючымі. У Брандэнбургу есць 6 каталіцкіх парафій, і адна — праваслаўная. Але праваслаўная суполка не мае свайго храму, і таму знайшла прытулак у каталікоў.

- Вялікі ўнесак у будаўніцтва дзіцячай вескі ў Гомелі зрабілі і нямецкія дзеці, - падкрэсліў кс. Рыхард. - У нашых парафіях есць такая традыцыя: пасля Калядаў з установы ва ўстанову, з кватэры ў кватэру ходзяць дзеці і збіраюць грошы на сацыяльныя патрэбы.

Ксендз Рыхард нагадаў, што дваццаць гадоў таму адбылося падзенне Берлінскага мура, і гэта свята для немцаў з'яўляецца вельмі радасным. «Хоть камуністычныя часы ва Усходняй Германіі не былі легкімі, але менавіта ў дні пераваронту людзі масава прыходзілі ў цэрквы — і лютэранскія, і каталіцкія. Былыя функцыянеры казалі, што яны былі падрыхтаваны на ўсе выпадкі нейкага гвалту ці рэвалюцыйнага пераваронту, толькі не да дэманстрацыі са свечкамі ў руках», - зазначыў святар.

Ен падкрэсліў, што з падзеннем Берлінскага мура ў Германіі ўсталявалася дэмакратычная сістэма, але разам з тым узніклі і новыя праблемы. «Свабода нам прынесла шмат чаго добрага, але таксама і праблемы для нашых цэркваў і веры», - канстатаваў кс. Рыхард. Ен растлумачыў, што раней, у камуністычныя часы патрэбна было вытрымліваць ціск з боку ўлады, а сення, пры свабодзе і матэрыяльным дабрабыце, людзі шукаюць матэрыяльных выгодаў і забываюць пра царкву.

Святар акцэнтаваў увагу на словах Евангелля, якое вернікі чулі ў нядзелю: «Зямля і неба пройдзе, а Мае Словы застануцца». «Нам шмат прыйшлося вытрымаць, але сення мы ведаем, што дыктатура прайшла — а Слова Езуса засталося. Усе пройдзе — але Словы Езуса застануцца!», - рэзюміраваў кс. Рыхард.

Ксендз Славамір дапоўніў, што спадзявацца трэба толькі на Бога — ва ўсім. «Чалавек адзін і той жа, ва ўсім свеце, ва ўсіх краінах. Ен хоча жыць, піць, гуляць, шукаць задавальненняў і ўласных выгодаў. Але толькі Езус робіць парадак — у галовах, думках, душах», - зазначыў святар.

*[Фота ў каталозе]*

### Гомельскі касцел наведаў знакаміты рэжысер Кшыштаф Зануссі

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 17.11.2009*



**16 лістапада ў Гомель прыехаў знакаміты польскі рэжысёр Кшыштаф Зануссі. У нашым горадзе ён адкрываў кінафестываль «Лістапад». Да ўрачыстага мерапрыемства госць паспеў наведаць касцёл Нараджэння Божай Маці, дзе сустрэўся з яго пробашчам Славамірам Ляскоўскім.**

Пазней, на прэс-канферэнцыі, рэжысёр распавёў аб сваім візіце ў храм: – Заўсёды прыемна пабываць у тых месцах, дзе каталікі ў меншасці. У Пекіне я таксама наведваў каталіцкі храм - размаўляў там з кітайцамі-каталікамі, гэта было мне цікава.

На прэсавай канферэнцыі пан Кшыштаф шмат распавядаў аб сваім бачанні мастацтва, адзначыў, што яно ні ў якім разе не павінна вучыць:

- Калі мастацтва бярэ на сябе ролю настаўніка, мы ўваходзім у таталітарны рэжым, гэтага не павінна быць ніколі. Мастацтва - такі працэс, дзе мы дзелімся з іншым чалавекам нашым вопытам і нашым сумневам. Мы не інжынеры чалавечых душ, гэта быў вельмі няправільны выраз. Мы павінны быць заўсёды партнёрам нашага гледача, а не настаўнікам.

Таксама рэжысёр, які, дарэчы, уваходзіць у склад Папскай рады, растлумачыў, чаму цяпер здымаюць так шмат дрэнных фільмаў:

- Мастацтва ў любы час выходзіць насустрач слабасці пакупніка і прапануе яму тое, што ён хоча ў сваёй маральнай і душэўнай слабасці. Таму столькі дрэнных і дурных карцін з'яўляецца, што людзі іх з задавальненнем купляюць. Але у публікі ёсць і іншае жаданне - каб мастацтва іх падцягваць вышэй, таму ёсць і іншыя прапановы. Гэта выбар чытача і гледача - ён вырашае, чаго ён яшчэ хоча і за што можа заплаціць. Пакупнік перш за ўсё вінаваты, а не той, хто яму прадае атручаныя тавары, таму што на іх напісана, што яны атручаныя, людзі гэта ведаюць, яны нясуць адказнасць за тое, што руйнуюць каштоўнасці.

Майстар кінематаграфіі успамінаў аб жыцці і творчасці ў камуністычнай Польшчы:

- Мы не выбралі той сістэмы - яна прыехала на савецкіх танках. У нас камунізм не быў карэнным, родным. Трэба было ў гэтым свеце знайсці спосаб, як працаваць, мы гэты спосаб знаходзілі. З 1956 года камуністычны рэжым у нас не быў такі строгі, як у іншых краінах. У нас казалі, што ў сацыялістычным лагеры Польшча была самым вясёлым баракам. Гэта нас забаўляла.

Цяпер рэжысёр працуе над новым сцэнарам:

- Гэты сцэнар ў абарону жанчын ад феміністак і ў абарону мужчын, таму што гэта з'ява стала небяспечнай, агрэсіўныя фемiністкі «забіваюць» мужчын і жанчын. Я люблю жанчын, а фэміністы іх не выносяць.

*[Фота ў каталозе]*

# Снежань

## Першы выпуск школы нараджэння "Дар жыцця" адбыўся

*Аўтар: Марыян Голуб*
*Дата стварэння: 01.12.2009*



**27 лістапада адбылася заключная святочная сустрэча ў школе нараджэння «Дар жыцця», якая на працягу двух месяцаў праходзіла ў парафіі Нараджэння Божай Маці. Тры шлюбныя пары вучыліся перажываць разам дабраславёны час чакання, а таксама рыхтаваліся да нараджэння і догляду за немаўлятам.**

27 лістапада адбылася заключная святочная сустрэча ў школе нараджэння «Дар жыцця», якая на працягу двух месяцаў праходзіла ў парафіі Нараджэння Божай Маці. Тры шлюбныя пары вучыліся перажываць разам дабраславёны час чакання, а таксама рыхтаваліся да нараджэння і догляду за немаўлятам. Шчыра віншуем усіх удзельнікаў з заканчэннем школы. Хай міласэрнасць Божая спадарожнічае вам, а Дух Святы дасць мудрасці ў выхаванні дзяцей. Асабліва віншуем Дзмітрыя і Наталлю Сяргеенка. 12 лістапада ў іх нарадзіўся сын Ілля. Няхай Гасподзь аберагае гэтае новае жыццё і вядзе яе па шляху выратавання.

У апошняй сустрэчы прыняў удзел пробашч парафіі ксёндз Славамір Ляскоўскі. Ён горача павіншаваў усіх удзельнікаў школы з яе заканчэннем, а таксама пажадаў паспяховых родаў і здаровых дзетак. Да свайго віншавання ксёндз Славамір дадаў некалькі словаў з пажаданнямі поспеху маладым сем'ям, якія чакаюць папаўнення.

Ксендз Славамір:

- Першае дзіця - гэта вельмі важны і адказны крок, на які вы вырашыліся. Але заўсёды памятайце аб тым, каб моцць сэрца адкрытае на новае жыццё і на ўсіх тых дзяцей, якіх дасць вам Пан. У большасці выпадкаў маладая сямейная пара сама плануе, колькі ў іх будзе дзяцей і калі яны народзяцца. Маладыя людзі ўвенчаны, потым чакаюць хлопчыка, ну і вядома ж дзяўчынку. А потым - усе ўжо як быццам дома. Гэта таму, што сэрца наша малое як пясчынка. Яно закрытае. У яго цэнтры стаіць наша «Я», нашы планы, кар'ера, муж, жонка ці дзеці і на адным з апошніх месцаў Ісус Хрыстос. Мудрыя габрэі кажуць: «Калі на першым месцы ў сэрцы стаіць Гасподзь Бог, то ўсё астатняе ўжо на сваіх месцах». Толькі Ісус Укрыжаваны і Уваскрослы можа зрабіць наша сэрца адкрытым і бяздонным для любові. Толькі Яго любоў да нас сапраўдная і толькі яна можа насыціць нашае сэрца і адкрыць яго на новае жыццё. Толькі з Ім можна прыняць трэцяга, чацвёртага і дзесятага дзіцяці. І ўсё ў нас у жыцці будзе ў парадку. Гасподзь сам паклапоціцца пра ўсіх гэтых дзяцей, якіх Ён нам дае як дар.

Удзельнікі школы падзякавалі ксяндзу Славаміру за такую выдатную магчымасць, якую ён даў шлюбных парам, чакаюць нараджэння дзіцяці. Таксама яны падзяліліся ўражаннямі аб прайшоўшай школе.

Грэчуха Зміцер:

- Школа нараджэння - цікавая і пазнавальная рэч. Даведаўся шмат новага і цікавага. Ўпершыню ўбачыў роды.

Грэчуха Алена:

- Я даведалася для сябе шмат новага, нягледзячы на тое, што перачытала шмат літаратуры. Таксама для мяне было важна, што гэтая школа не толькі для будучых мам, але і для тат.

Машкоўскі Слава:

- Я пачаў ставіцца да родаў спакойна, не баяцца за Юлю, за нашу дачушку і за ўсё, што гэта акаляе.

Машкоўская Юлія:

- Для мяне былі значнымі зносіны з іншымі будучымі мамамі. Я набыла упэўненасць у сабе і ў сваіх сілах. Гэта вельмі важна для мяне!

Сергеянка Зміцер:

- Школа вельмі дапамагла правільна і адэкватна ставіцца да працэсу цяжарнасці і родаў, а таксама не баяцца і не панікаваць.

Сергеянка Наталля:

- Школа дапамагла мне пераадолець страх перад родамі. Я даведалася для сябе шмат новага і цікавага.

*[Фота ў каталозе]*

## Хрысціянскія канфесіі Гомеля абмеркавалі праблему СНІДа

*Аўтар: Алена Германовіч*

*Дата стварэння: 03.12.2009*



**2 снежня ў Гомелі грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя дзяцей і моладзі» пры падтрымцы царквы Евангельскіх хрысціян-баптыстаў і міжканфесійнай місіі «Хрысціянскае сацыяльнае служэнне» арганізавала семінар па праблемах ВІЧ-інфекцыі.**

На мерапрыемства былі запрошаны супрацоўнікі медыцынскіх устаноў і прадстаўнікі асноўных канфесій горада — каталіцкай, праваслаўнай і ЕХБ.

Медыкі азнаемілі ўдзельнікаў семінара з эпідэмічнай сітуацыяй па захворванню ВІЧ/СНІД у вобласці.Як вядома, наш рэгіен займае ў рэспубліцы лідзіруючае становішча па колькасці ВІЧ-інфіцыраваных людей. На 1 лістапада ў Беларусі зарэгістравана болей 10,5 тыс. выпадкаў ВІЧ-інфекцыі, з іх амаль палова (болей 5,4 тыс.) - жыхары Гомельскай вобласці. Большасць хворых ВІЧ/СНІД — гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Павялічылася колькасць людзей, інфіцыраванне якіх адбылося палавым шляхам — з пачатку 2009 года праз палавыя кантакты былі інфіцыраваныя 76,7% захварэўшых.

І праваслаўны святар, айцец Вадзім Качан, і пробашч гомельскага касцела ксендз Славамір Ляскоўскі, і пастар царквы Евангельскіх хрысціян баптыстаў Леанід Калеснічэнка ў сваіх выступах мелі адзін салідарны, характэрны месідж: СНІД не з'яўляецца толькі медыцынскай праблемай, яго немагчыма спыніць рознымі акцыямі і шырокайасветніцкай працай, раздачай прэзерватываў, вырашаць праблему трэба, пачынаючы з прычыны, а не следства.А прычына эпідэміі — гэта духоўныя хваробы чалавека, усяго грамадства, распутнасць, грэблівыя адносіны да Божага Закону, Божых Запаветаў. «Праблема СНІДа, якая вылучаецца з кантэксту агульнага хворага стану грамадства — гэта трохі штучная рэч, таму што карані многіх сацыяльных хваробаў, якія зараз існуюць, аднолькавыя. На хрысціянскай мове яны абазначаюцца словам «грэх», - падкрэсліў айцец Вадзім Качан.

Кс. Славамір адзначыў, што дзе есць праблема чалавека — там і Касцел прысутнічае ў гэтай праблеме. І таму натуральна, што з пачаткам эпідэміі СНІДа Ватыкан надаваў гэтаму пытанню пэўную ўвагу і істотную падтрымку ВІЧ-інфіцыраваным людзям. Спасылаючыся на меркаванні каталіцкіх біскупаў, ксендз зрабіў акцэнт, што пытанне СНІДу тычыцца двух Божых Запаветаў: «не забівай» і «не чужалож». «Запаветам «Не забівай» мы пакліканы не забіваць, і ў той жа час абараняць свае жыцце. Поўнасцю перажыць сваю сэксуальнасць можна толькі ў шлюбе — адзіным на ўсе жыцце. З гэтага трэба пачынаць, да гэтага трэба вяртацца. Таму што распуста, якая сення існуе ў грамадстве, толькі садзейнічае розным праблемам, у тым ліку і СНІДу. Для абароны каштоўнасцей сэксуальных зносінаў Бог нам даў запавет «Не чужалож». Сэксуальныя адносіны з'яўляюцца вялікай праявай чалавечай любові, якая знаходзіць поўнае свае адлюстраванне ў шлюбе. Сэксуальнасць — гэта адзінства, любоў і дзеці. І гэтых трох вымярэнняў нельга штучна падзяляць. Жыцце ахоўваецца выкананнем гэтых двух запаветаў. Мы можам абараніць сябе ад СНІДу, ахоўваючы жыцце і яго сэксуальную сферу ад жорсткай агрэсіі», - растлумачыў пробашч.

Ен паведаміў удзельнікам мерапрыемства, што афрыканскія біскупы прыйшлі да высновы, што толькі цнатлівасць здольна спыніць эпідэмію СНІДа. «Толькі вучэнне Бібліі аб цнатлівасці можа спыніць СНІД. Яшчэ ніхто не памер ад цнатлівасці, а ад СНІДу паміраюць. Устрыманне не патрабуе фінансавых выдаткаў, рана ці позна распутнае жыцце, нават з прэзерватывамі, прыводзіць да СНІДу», - гаворыцца ў лісце афрыканскіх біскупаў.

Айцец Вадзім Качан выказаў меркаванне, што пры размовах з дзецьмі, моладдзю не трэба акцэнтаваць увагу на праблеме СНІДу, бо за штогадовыя аднапланавыя лекцыі і гутаркі моладзь ужо стамілася слухаць адно і тое ж. «Моладзі трэба казаць пра тыя праблемы, якія іх хвалююць — як стаць шчаслівым, як знайсці сябе, жыць у гармоніі са светам і самім сабой. Трэба казаць пра культурныя, духоўныя, сямейныя традыцыі, пра тое, чым пагражаюць у жыцці грэблівыя адносіны да маральных каштоўнасцяў, Божых Запаветаў. Біблія нічога не забараняе, яна папярэджвае. Як правілы дарожнага руху. Ты вольны іх не выконваць, але такія паводзіны рана ці позна прывядуць да катастрофы. Так і грэблівыя адносіны да Божых Запаветаў прывядзуць чалавека да жыццевай катастрофы», - лічыць святар.

Пастар Леанід Калеснічэнка спыніўся ў сваім выступе на такіх момантах, як выхаванне дзяцей. Ен выказаў меркаванне, што сям'я выконвае дамінантную ролю ў духоўным выхаванні дзяцей. Пастар дасціпна, на ўзорах з асабістага жыцця расказаў, як трэба выхоўваць дзяцей, каб быць для іх асабістым прыкладам, аўтарытэтам, сябрам і лепшым памочнікам і дарадчыкам. Кажучы пра праблему СНІДа, Леанід Калеснічэнка даў сваю расшыфроўку гэтаму паняццю: «Систематическое Пренебрежение Истинным Декалогом».
*[Фота ў каталозе]*

### "Гомельскія вернікі маюць глыбокае спазнанне сваей грэшнасці"

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 06.12.2009*



**На працягу трох дзен ксендз Арыюш Малыска з Маладзечна праводзіў Адвентовыя духоўныя практыкаванні ў гомельскай парафіі. У сваіх казаннях госць з Ордэну капуцынаў датыкаўся такіх паняццаў, як грэх, дабро і зло, закранаў пытанні веры, еўхарыстыі, разам з парафіянамі разважаў аб выхаванні дзяцей, сужэнскіх адносінах.**

Адметна, что ўвесь час ксендз размаўляў з гомельцамі па-беларуску? хоць сам родам з маленькай вескі на Мазурах (Польшча) і пачаў служыць у Беларусі толькі ў 2007 годзе. Ен прыехаў у веску Замосце Слуцкага раена, не ведаючы ніводнага беларускага слова. На пачатку прасіў маладых людзей, каб нешта растлумачылі, не разумеў некаторых граматычных правілаў. А потым купіў сабе кніжкі і чытаў іх, узбагачаў свой слоўнік. Працягвае гэта рабіць і цяпер – спазнаваць мову, каб мець магчымасць сказаць больш.

У Маладзечне кс. Арыюш служыць пробашчам парафіі Св. Казіміра з сярэдзіны кастрычніка гэтага года, зараз займаецца будаўніцтвам новага касцела ў райцэнтры, які будзе названы ў гонар Св. Айца Піо.

На рэкалекцыях у Гомелі айцец ужо ў другі раз. Мае намер прыехаць да гомельцаў і пасля Вялікадня – праводзіць наступныя духоўныя практыкаванні. Мы запыталіся ў кс. Арыюша аб яго ўражаннях ад гомельскай парафіі, ці мае яна свае асаблівасці.

– Асаблівасці, канечне, есць. Такія, што рэдка сустрэнеш у іншых парафіях. Тут большая частка людзей мае глыбокае спазнанне сваей грэшнасці, слабасці – праўда, у канкрэтных рэчах. Дзякуючы гэтаму, адчуваецца спадзяванне на Бога. Але не натуралістычнае, а такое, што сваю крыніцу знаходзіць у веры ў Езуса Хрыста, які вядзе жыцце чалавека. Не такое, што есць я, які прашу дапамогі ў Бога ў нейкіх справах. Калі чалавек не адчувае сябе грэшным, прапанова Збавіцеля не трапляе да яго ўвогуле. Бо павінен быць не толькі грэшнік, але і канкрэтныя грахі. Тады слова Божае пачынае дзейнічаць, калі чалавек адкрывае праўду пра сваю слабасць.
*[Фота ў каталозе]*

## Калядныя казкі ад маленькага Юры

*Аўтар: ул. інф.*
*Дата стварэння: 20.12.2009*



**Адзін з самых маленькіх вернікаў гомельскага касцёла - Юра, яму яшчэ толькі 7 гадоў. Але, мяркуючы па казкам хлопчыка і яго разважаннях пра Бога, шмат чаго ён разумее нават лепш некаторых дарослых.**

Да свята Нараджэння Хрыстовага ў Юры нарадзіліся дзве гісторыі, якія мы прапануем чытачам сайта. Хай аповед пра Санта Клаўса і не падобны на версію дарослых аб гэтым чараўніку, але для дзяцей гэта не мае значэння. У іх свой свет, і ён цудоўны. Да прыкладу, Юра сказаў нядаўна: «На нашай планеце ёсць толькі адзін Бог - Хрыстос. Не ведаю, якія там ёсць богі на іншых планетах. Напэўна, у іх няма Ісуса. Таму і жыцця там няма». Цяжка не пагадзіцца. Такім чынам, жылі-былі Санта Клаўс і Ісус, і сябравалі яны. Але калі Ісус адправіўся на неба, Санта Клаўс чамусьці застаўся на зямлі. Аб ім мы даведаемся зараз.

Быў такі Святы Мікалай і маліўся ён Богу. І раптам адбыўся цуд. Калі ён спаў, яму прысніўся Новы год, як усе дзеці радуюцца, а ў той час не было такога свята. І раптам, калі Святы Мікалай прачнуўся, ён убачыў на стале касцюм Санта Клауса, і так зразумеў, што гэтае свята ён толькі можа зрабіць. Але тут Бог забраў яго на неба.

І яны сябравалі з Ісусам, гулялі, каб яму было не сумна. І глядзелі за людзьмі, што яны твораць. Але раптам Санта Клаўс ўзгадаў пра Новы год, і Бог яму сказаў, што хутка будзе гэтае свята. І адправіўся да дзяцей на Новы год і Каляды. Кожнаму на акенца паклаў па падарунку і стаміўся. Але Бог зрабіў так, што ў яго сталі лятаючыя алені, яны яго паўсюль каталі. Хоць ён Санта Клаўс, але многія дзеці называюць яго Дзедам Марозам.

* * *

Жыла ў Гомелі дзяўчынка Маша, хадзіла яна ў другі клас. І была ў яе мара - стаць касманаўткай і паляцець у космас, каб убачыць Бога. Яна ў той час не ведала, хто гэта, але ўсе людзі маліліся, цэрквы пабудавалі, апавядалі нейкія гісторыі, але яна нічога не разумела. Ды на Каляды з ёй здарылася адна прыгода, дакладней сказаць цуд. Ішла яна і ўбачыла перад сабой анёла. Ён сказаў: «Ты, дзяўчынка, цікавішся Ісусам?». Яна адказала: «Так, я ведаю, што Ён жыве ў Царстве Нябесным». Анёл сказаў, што гэта праўда, але нават калі яна стане касманаўткай, то ўсё роўна да яго не даляціць, і ён усё роўна нябачны. А сустрэць яго лёгка можна па-іншаму: маліцца Богу і рабіць добрыя справы. І паляцеў анёл. І стала Маша дапамагаць бацькам, бедным людзям. У яе была мара: яна збірала грошы, каб купіць акварыюм з чарапашкамі. Але ўсе грошы аддала жабракам. І адной ноччу, перад Калядамі, яна прачнулася і ўбачыла яркі свет - гэта быў Бог. А раніцай каля ложка стаяў акварыюм з сапраўднай жывой чарапашкай. Яго падарылі ёй бацькі за тое, што Маша стала такой добрай.

*[Фота ў каталозе]*

## Раство ў маім дзяцінстве

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 23.12.2009*



**Набліжаецца свята Нараджэння Хрыстовага, і мне ўзгадваецца маё дзяцінства, як я маленькай разам з дарослымі рыхтавалася да Вігіліі.**

*Традыцыі калядных страў (і тых, якія рыхтуюць напярэдадні, на Куццю) у нашай сям'і гавораць пра невысокім дастатку продкаў. Ад прабабуляў і бабуль захаваліся звычаі ў ежы 24 снежня. Сам стол накрывалі белым даматканым абрусам, пад які кладуць сена - гэта сімвалізуе яслі, у якіх нарадзіўся Ісус. Пакуль дарослыя мітусяцца і накрываюць на стол, дзеці выбягаюць на вуліцу і чакаюць першай зоркі, пасля якой усе садзяцца за стол.*

Стравы павінны быць посныя, традыцыйна іх рыхтуюць 12, бо гэта магічны лік, столькі было апосталаў у Ісуса, столькі месяцаў у годзе, бо Каляды - гадавое свята.

Свечка - без яе ніяк. Спярша, пасля з'яўлення на небе першай зоркі чыталі чытанне з Евангелля, «Ойча наш», затым дзяліліся аплаткай. Абавязковы атрыбут стала напярэдадні Калядаў - куцця. Яе рыхтавалі з пярловай крупы ў гаршчку ў печы (маленькім чыгунным, у ім жа ставілі куццю на сярэдзіну стала) і падавалі першай стравай. Але ксёндз Славамір кажа, што сапраўдная куцця павінна быць салодкая - як сімвал маючай адбыцца радаснай падзеі. Таму яе трэба рыхтаваць з цэлых зерняў ачышчанай пшаніцы, дадаваць мак, арэхі, разынкі, мёд. І падаваць у канцы - як салодкую страву.

**Рыба** - сімвал хрысціянства. Таму яна таксама займала ганаровае месца на нашым стале - заліўная, фаршыраваныя, марынаваныя - селядзец, да прыкладу.

**Кампот з сухафруктаў** - яблыкаў, груш, сліў. Кісель і аладкі - больш для дзяцей, але ўсё роўна абавязкова. Аладкі рабілі прэснымі - то бок без закваскі, яек, малака. Яны выкарыстоўваліся, дарэчы, замест хлеба, паколькі хлеб мае закваску. Кісель варыўся густы - залівалі ў міскі, ён застываў так, што яго можна было рэзаць нажом.

**Мак**. Залівалі кіпнем, затым расціралі песцікам ў ступцы, звычайна гэтую нялёгкую, дарэчы, працу, давяралі дзецям - расціраць, пакуль мак не пабялее. Затым дадавалі цукар, залівалі кіпенем, і ў глыбокіх талерках ставілі на стол.

**Грыбны квас**. Сушаныя грыбы (лепш - белыя) замачыць, затым адварыць, чым больш грыбоў - тым лепш, дадаць цыбулю, абсмажаную на алеі, прыправы, у прыватнасці, лаўровы ліст, і яшчэ раз добра уварыць, дабавіўшы муку.

Грыбы марынаваныя. Зліць расол, дадаць цыбулю і алей.

**Салата**. Да прыкладу, вінегрэт або з кіслай капусты.

На Каляды стол накрывалі ўжо багата - стравы з свініны, смажаныя хатнія кілбаскі, бульбу з мясам і грыбамі запякалі ў печы. Запякалі ў печы птушку - качак, гусей з яблыкамі, чарнаслівам. Абавязкова ставілі на стол арэхі, прысмакі, пяклі торт. Карацей, святкавалі. Дарэчы, стравы, стол - гэта толькі знешні антураж і даніна традыцыям. Галоўнае - **не забыць аб імянінніку Ісусе Хрысце,** для якога

патрэбна адкрыць сэрца і чакаць Яго, прыняць, праз каго бы Ён не з'явіўся - непрыемнага нам калегі, бамжа, ад якога непрыемны пах, псіхічна хворага чалавека, які чакае на Каляды, што яго хто-небудзь наведае. Свята будзе не святам, калі напярэдадні - да 12-й ночы або раніцай не сходзіць у касцёл і не сустрэць Каляды на набажэнстве з братамі-хрысціянамі, малітвамі і песнямі. Зараз Нараджэнне святкуецца вельмі ўрачыста - з канцэртамі, феерверкамі. Падабацца гэта свята і бедным людзям - у гэты дзень грэх не падаць ім добрую міласціну або не пачаставаць смачнымі стравамі. У нас у пад'ездзе на Каляды спаў бомж, мы каля яго паставілі паўторта. Напэўна, узрадваўся, калі прачнуўся раніцай.

**Парады пробашча гомельскага касцела кс. Славаміра аб падрыхтаванні да Вігіліі чытайце у ягоным інтэрв'ю газеце "Камсамольская праўда" у Беларусі" у нумары за 22 снежня**

## З Раством Хрыстовым! ФОТА і ВІДЭА з першай святочнай імшы

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 25.12.2009*



**Первая Рождественская служба в гомельском костеле Рождества Божьей Матери началась в ноль часов 25 декабря. Вместе с родителями в полночь пришли в храм много детей, к ним кс. Славомир обратился в первую очередь, призвав не спать, чтобы не прозевать момент прихода в собрание Иисуса Христа.**

Пробашч касцёла вітаў гасцей, якія прыехалі ў Гомель з іншых месцаў Беларусі і нават з далёкіх краін, маючы на ўвазе студэнтаў з Шры-Ланкі. Таксама кс. Славамір перадаў віншаванні з Раством ад прадстаўнікоў мясцовых уладаў, у прыватнасці, ад старшыні гарвыканкама.

Завершылася начная імша святочным феерверкам. Прапануем увазе чытачоў сайта відэарэпартаж з першага каляднага Багаслужэння 2009 года.

*[Фота ў каталозе]*
*[Відэа глядзіце на канале https://www.youtube.com/user/nusmumrikLJ]*

## Гомельскія памежнікі прынялі ўдзел у імшы на Раства

*Аўтар: ул. інф*
*Дата стварэння: 25.12.2009*



**У пятніцу, 25 снежня, у святочным Багаслужэнні з нагоды Нараджэння Хрыстова прыняў удзел асабовы склад Гомельскай памежнай групы. Ваенныя-каталікі калектыўна прыйшлі на Святую Імшу ўпершыню. У гутарцы з пробашчам касцёла ксяндзом Славамірам Ляскоўскім памежнікі выказалі намер з гэтага часу стала ўдзельнічаць у набажэнствах,** а таксама кожны раз

ушаноўваць Нараджэнне Хрыстова ў частцы. Пасля імшы новыя парафіяне сфатаграфаваліся на памяць з ксяндзом-пробашчам.
*[Фота ў каталозе]*

### Завершана 9-месячная малітва за ненароджаных дзяцей

*Аўтар: ул. інф*
*Дата стварэння: 25.12.2009*



**25 снежня вернікі гомельскага касцела скончылі 9-месячную малітву за ненароджаных дзяцей. Як сімвал уратаванага дзіцяці многія вернікі прынеслі ў храм па ружы, якія былі пастаўлены перад алтаром.** У гомельскім касцёле такія малітвы з'яўляюцца традыцыйнымі ўжо на працягу шасці гадоў. Яны пачынаюцца ў сакавіку, у свята Звеставання Пана.

Кожны прыносіў ружу ў знак сваей любові да дзіцяці, за якога маліўся, у знак таго, што Пан Бог з любоўю ставіцца да кожнага жыцця, якое зачата ва ўлонні маці. І нават калі яно, жыцце, прыходзіць такім жахлівым чынам — праз гвалт. Бог бароніць кожнае жыццё – гэта есць падмуркам традыцыйных 9-месячных малітваў.
*[Фота ў каталозе]*

### Святочныя дні ў гомельскім касцёле: канцэрт класічнай музыкі і дзіцячая Бэтлеемка

*Аўтар: Паўлюк Міцкевіч*
*Дата стварэння: 27.12.2009*



**Урачыстымі службамі не абмежавалася святкаванне Раства Хрыстова ў гомельскім касцёле. Увечары 26 снежня тут прайшоў Калядны канцэрт, які даў камерны аркестр Гомельскай абласной філармоніі пад кіраўніцтвам Таццяны Томсан, а назаўтра пасля ранішняй Імшы ў храме выступілі дзеці.** Яны паказалі Бэтлеемку - спектакль пра нараджэнне Збаўцы. Рэжысіравала пастаноўку сястра Катарына з ордэна міласэрнасці Маці Тэрэзы.

Падчас традыцыйнага канцэрту, які ўжо шмат гадоў на Раство праходзіць у касцёле, у залі не было вольных месцаў. Тыя, хто жадаў набыць квіткі ў дзень мерапрыемства, зрабіць гэта не змаглі - усё было прададзена задоўга да канцэрта. Аркестр Таццяны Томсан іграў класічную музыку, прагучалі знакамітыя творы Габрыэля Форэ, Іагана Себасцьяна Баха, Антоніа Вівальдзі, Вольфганга Амадэя Моцарта.

Перад пачаткам канцэрта кс. Славамір павіншаваў шматлікіх слухачоў з Калядамі і пажадаў, каб Хрыстос знайшоў месца ў сэрцы кожнага. Таксама ён нагадаў вядомае выслоўе аб тым, што музыка як мастацтва спрыяе атрыманню інфармацыі Боскай.

Паказ Бэтлеемкі быў прымеркаваны таксама і да ўрачыстасці Святога сямейства. Ксендз Аляксандр заклікаў вернікаў браць прыклад з сямейнага жыцця Марыі і Іосіфа, якія на Божы заклік адказвалі: «Так, Госпадзе». Ксёндз адзначыў, што ў нашай краіне і ва ўсім свеце моцныя сем'і сталі вялікай рэдкасцю: «Святы - гэта зусім не той, хто ходзіць з німбам над галавой. Жыць у сям'і ў святасці - значыць, мець адносіны, дыялог з Богам, калі кожны член сям'і ставіць Бога на першае месца, калі ў сям'і ўмеюць любіць і прабачаць".

А ў панядзелак Бэтлеемку паказалі ў Доме міласэрнасці сясцер Ордэна Маці Тэрэзы. Маленькія парафіяне касцела выступілі перад дзеткамі з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў.

*[Фота ў каталозе]*

## Год мінулы, год будучы

*Аўтар: Алена Германовіч*
*Дата стварэння: 30.12.2009*



**Яшчэ адзін год нашага жыцця, нашай дзейнасці, нашых радасцяў, клопатаў, шчасця і расчараванняў падышоў да канца. З якімі вынікамі гомельская парафія сустракае Новы Год? Якія планы ў нашага касцёла і дэканата на 2010-ы? Пра гэта мы пагутарылі з ксяндзом-дэканам Славамірам Ляскоўскім.**

– Тое, што радуе: мы правялі евангелізацыю, як вынік - утварылася новая суполка, новыя людзі прыйшлі ў касцёл - гэта мэта нашага жыцця і працы парафіі, - кажа кс. Славамір. - Група дзяцей прыняла Першую камунію, а самыя маленькія – **Хрышчэнне**, такіх было, каля дваццаці за год, гэта добра для нашай парафіі. Важна, што нам удалося памяняць **дах** на касцеле, не можа не радаваць, што сродкі на новы дах сабралі ўсім светам, ахвотна на заклік аб дапамозе адгукнуліся нашы парафіяне: хтосьці ахвяраваў грошы, нехта асабіста прымаў удзел у рамонце, фарбаванні храма, дапамаглі і спонсары, вядома.

У гэтым годзе ў нашага касцёла з'явілася свая **вэб-старонка**, спадзяюся, сайт запатрабаваны ў людзей, ёсць наведвальнасць, і з-за мяжы ў тым ліку. З'яўляюцца новыя рубрыкі, ідэі, мультымедыя.

На працягу года працягвалася будаўніцтва **вёскі для дзяцей-інвалідаў**. Гэта вельмі важны праект - для дзяцей, для ўсіх нас. Ёсць планы, і надзея, што ўвосень 2010 года будзе адкрыта першая чарга дзіцячай вёскі.

У гэтым годзе, упершыню за 20 гадоў, першая дзяўчына з нашай парафіі пайшла ў **манастыр**.

Што радуе - гэта, вядома, стварэнне новых сем'яў, тое, што ўжо ўвенчаны тыя хлопцы і дзяўчаты, якія былі выхаванцамі нашай нядзельнай школы, я іх добра памятаю яшчэ дзецьмі. Разам з тым, ужо дзеці тых «дзяцей» прыходзяць у нашу нядзельную школу. Так што ўжо другі, трэці круг пачынаем. Сапраўды - спачатку бабулькі, потым іх дзеці, унукі, і на вачах мяняюцца пакаленні, перадаецца вера.

Нашы парафіяне ўдзельнічалі на працягу года ў **пілігрымках**, такім чынам пабывалі ў Будславе, Браславе, Лагішыне, Лунінцы. Моладзь ездзіла ў Івянец на традыцыйныя «музычныя майстэрні» і міждыяцэзіяльную сустрэчу моладзі. У Пінску былі двойчы: на 70-годдзе пасвячэння ксяндза-кардынала Казіміра Свёнтка, і на святкаванні 95-годдзя кардынала.

Працягваецца **«Школа веры».** Зараз яе наведваюць каля 20 чалавек.

Ёсць і праблемы, вядома. Да прыкладу - няма памочніка у настаяцеля, а гэта адбіваецца на ўзроўні душпастырская працы. Не ўсюды я паспяваю, безумоўна, патрэбны другі святар, чакаем вырашэння гэтага пытання. У нас мала прасвітэраў - сваіх, беларусаў. Не хапае святароў і ў вобласці - прынамсі, 3-4 ксяндза былі б вельмі і вельмі дарэчы.

У 2009 годзе ўбачыла свет **кніга** «Касцёл і ўлада на Гомельшчыне: 20-30 гады». У наступным годзе плануецца выданне яшчэ адной кнігі аб нашым касцёле, Гомельскім дэканаце аўтара Уладзіміра Васькова. Кніга на дадзены момант праходзіць рэдагаванне ў выдавецтве «Про Хрысто».

Галоўнае, асноўнае – евангелізацыя, праца ў парафіі, міласэрнасць. У гэтай сувязі нельга не згадаць пра сясцёр **Ордэна Маці Тэрэзы** і бенедэктынак-самарыцянак - іх служэнне прыносіць бачны плён. Іх служэнне дало станоўчы адбітак і рэзананс у грамадстве. Яны ў літаральным сэнсе выратавалі, выцягнулі з пекла п'янства некаторых людзей, паднялі на ногі. Яны вярнуліся ў жыццё, яны вырваны з рук смерці. Служэнне сясцёр **бенедэктынак-самарыцянак** нясе вялікую любоў да дзяцей-інвалідаў, сіротаў. Многім яны вельмі дапамагаюць. Некаторыя без іх дапамогі проста памерлі б. Такія справы робіць любоў - гэта здаецца неверагодным.

Калі казаць аб дэканаце - ідзе, і паспяхова, рэстаўрацыя касцёла ў **Рагачове**, і ўжо ў наступным годзе, думаю, гэты касцёл набудзе Боскі выгляд. Пакуль Набажэнствы там праходзяць летам - у часовай капліцы каля касцёла, а зімой - у невялікім парафіяльным доме.

ШТО ЧАКАЕ НАШУ ПАРАФІЮ Ў 2010 ГОДЗЕ?

– Евангелізацыя - самае галоўнае - будзе працягвацца. 18 студзеня 2010 года пачнуцца ў касцёле **катэхезы**. Запрашаем усіх жадаючых. На наступны год плануецца, што парафіяне, тыя, хто яшчэ не прымаў, прымуць восенню мірапамазанне. Гэтае пытанне вырашым з кардыналам. Не выключана магчымасць, што ў кастрычніку пройдзе беатыфікацыя Папы Яна Паўла Другога, калі так будзе - то, напэўна, арганізуем **пілігрымку ў Рым**. Але я яшчэ хацеў, каб да чэрвеня мы паехалі ў Францыю да Святога Яна Віанэя, апекуна святароў. Бо гэты літургічны год Папа Бэнэдыкт Шаснаццаты абвясціў годам святарства. Будзем вырашаць гэтае пытанне. Дарэчы, за мінулыя дваццаць гадоў былі чатыры нашых маладых парафіянаў рукапакладзены ў **святары**. Першы - гэта Павел Халяўкін, які зараз з'яўляецца пробашчам пад Брэстам. Ксёндз Яўген Казлоў працуе вандроўным прэсвітэрам на поўдні Польшчы. Аляксандр Каліноўскі - пробашч у горадзе Актаў у Казахстане, і Аляксандр Драбышэўскі - вандроўны святар у Беларусі. Ёсць таксама тры **семінарысты** ў дадзены момант - Мікалай вучыцца ў Варшаве ў Redemptoris

Mater, у аналагічнай семінарыі ў Кіеве вучыцца Віктар, і Арцём у Ордэне францысканаў ў Санкт-Пецярбургу.

У 2010 годзе плануецца рэгістрацыя **новай парафіі** - у гомельскім раёне Навабеліца, з перспектывай будаўніцтва невялікага храма там.

Напрыканцы размовы кс. Славамір звярнуўся з навагоднімі пажаданнямі да наведвальнікаў сайта касцела і да ўсіх парафіянаў:

*– Я рады кожнаму, хто заходзіць на наш сайт. Чакаем прапановаў нашых наведвальнікаў, пытанняў - гэта важна, каб мы ведалі, што людзі чакаюць ад нас. Напярэдадні Новага Года я жадаю усім, каб новы год сапраўды стаў новым, не таму што будуць новыя падзеі, а каб мы з новым, мудрым сэрцам падыходзілі да ўсяго, што нас сустракае, каб больш бачылі Бога ў нашай гісторыі. Жадаю, каб усе адчулі, што Бог іх любіць і што сапраўды хоча для іх толькі добрага. Каб Пан знайшоў гэтае месца ў нашым сэрцы, дзе ён мог бы сапраўды жыць і прынесці нам тое, чаго кожны з нас хоча - любоў, мудрасць, сілы - каб жыць так, як Ён кажа.*